Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Уперад

№ 15 (250) серада 14 сакавіка 1945 г.

Орган Лідскага Г.К. і Р.К. КП (б) Беларусі, Гарадскога і Раённага Совета Дэпутатаў Працоўных.

Цана 15 кап.

**„У вялікіх бітвах Айчыннай вайны супроць нямецкага нашэсця Чырвоная Армія выратавала народы Совецкага Саюза ад нямецка-фашысцкага рабства, адстаяла свабоду і незалежнасць нашай Радзімы і дапамагла народам Еўропы скінуць нямецкае іга“**

(З загада тав. Сталіна да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі).

## ЗВАРОТ

### Калектыва работнікаў лідскага завода сельгасмашына - будаўніцтва № 1

**Да ўсіх рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў прамысловасці і транспарта г. Ліды**

Дарагія таварышы!

Мы з вялікім натхненнем сочым за пабеданосным наступленнем геpaічнай Чырвонай Арміі, якую вядзе геніяльны палкаводзец Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін да поўнай перамогі над германскім імперыялізмам.

Цяпер, калі Чырвоная Армія падышла да сэрца гітлераўскай Германіі—Берліна, наш народ усімі сродкамі дапамагае фронту, каб Чырвоная Армія, разам з арміямі нашых саюзнікаў, у самы кароткі тэрмін сакрушыла гітлераўскую Германію.

У гістарычным загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна сказана:

„Поўная перамога над немцамі цяпер ужо блізка. Але перамога ніколі не прыходзіць сама,—яна здабываецца ў цяжкіх баях і ўпорнай працы“.

Выконваючы свой доўг перад Радзімай і Чырвонай Арміяй, мы, работнікі лідскага завода сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва № 1, выканаўшы вытварчы план 4-га квартала 1944 года на 117 процантаў і план студзеня 1945 года на 134 проценты, натхнёныя загадам вялікага Сталіна, уключаемся ў прадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва і бяром на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Датэрмінова выканаць вытварчыя планы сакавіка і красавіка і даць звыш плана 10 процантаў прадукцыі.

2. Выпусціць тавараў шырокага спажывання на 50 тысяч рублёў.

3. Дабіцца павялічэння вытворчасці працы на 10 процантаў.

Знізіць сабекошт выпускаемай прадукцыі супроць плана на 10 процантаў.

5. Зэканоміць паліва і электраэнергіі на 10 процантаў.

6. 25 процантаў складу рабочых ахапіць тэхнічнай вучобай па павышэнню кваліфікацыі.

7. Да дня 1-мая цалкам завяршыць аднаўленне завода і зліквідаваць усе паследкі нямецкага гаспадарання.

Прымаючы гэтыя соцыялістычныя абавязацельствы, мы заклікаем усіх рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў прадпрыемстваў і транспарта горада Ліды паследваць нашаму прыкладу, разгарнуць прадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва і змагацца за перавыкананне вытварчых планаў.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пад вадзіцельствам вялікага Сталіна—уперад да поўнай перамогі над ворагам!

Няхай жыве наша гераічная Чырвоная Армія!

Няхай жыве Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін.

Па даручэнню агульнага схода калектыва лідскага завода сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва № 1 зварот падпісалі:

Дырэктар завода **Макееў.**

Сакратар партыйнай арганізацыі **Сыцко.**

Старшыня завадскога камітэта прафсаюза **Трышчанка.**

Стаханаўцы: **Чарнаус. Раманоў. Ясельскі.**

## ПАСТАНОВА

### Лідскага Гарадскога Камітэта КП(б) Беларусі

1. Адобрыць узятыя абавязацельствы і ініцыятыву калектыва работнікаў завода сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва № 1, аб разгортванні прадмайскага соцыялістычнага спаборніцтва, накіраванага на датэрміновае выкананне і перавыкананне вытварчых планаў сакавіка і красавіка г. г.

2. Абавязаць вузлавы партыйны камітэт станцыі гор. Ліда, сакратароў пярвічных партыйных арганізацый і кіраўнікоў прадпрыемстваў абмеркаваць на сходах рабочых і служачых сваіх прадпрыемстваў зварот калектыва завода сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва № 1 аб разгортванні прадмайскага соцыялістычнага спаборніцтва і ўзяць кожным цэхам, зменай, брыгадай, канкрэтныя абавязацельствы па ўвялічэнню выпуска прадукцыі звыш плана; зніжэнню яе сабекошту; эканоміі паліва, змазачных вяшчэстваў і электраэнергіі і па хутчэйшай ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі.

3. Абавязаць рэдакцыю газеты „Уперад“ сістэматычна асвятляць на старонках газеты ход і выкананне абавязацельств прадмайскага соцыялістычнага спаборніцтва.

**Гарадскі Камітэт КП(б) Беларусі**

## Кніга І. В. Сталіна „Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза“ на беларускай мове

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі выпускае тыражом у 20.000 экземпляраў кнігу І. В. Сталіна „Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза“. Кніга выпускаецца на беларускай мове.

У яе ўваходзяць: Выступленне па радыё 3 ліпеня 1941 г., даклады на ўрачыстых паседжаннях Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі, загады, адказы на пытанні карэспандэнтаў.

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### Аператыўная зводка за 12 сакавіка 1945 г.

Войскі 2-га **Беларускага** фронта, прадаўжаючы наступленне, авалодалі важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да **Данцыга і Гдыні**—гарадамі **Тчэў (Дыршаў), Вейхарава (Нойштадт)** і выйшлі на пабярэжжа Данцыгскай бухты на поўначы ад **Гдыні**, заняўшы горад **Пуцк** (Путціг). Адначасова войскі фронта занялі больш 100 другіх населеных пунктаў і сярод іх Квашын, Коллетцкаў, Рэшке, Гневаў, Гросс-Шлатаў, Зеллістраў, Польцын, Верблін, Шлавошын, Карвен. За 11 сакавіка ў гэтым раёне ўзята ў палон больш 2000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 1-га **Беларускага** фронта, пасля ўпорных баёў, 12 сакавіка штурмам авалодалі горадам і крэпасцю **Кістжын** (Кюстрын)—важным вузлом шляхоў зносін і магутным апорным пунктам абароны немцаў на рацэ Одэр, прыкрываючым подступы да Берліна.

У Венгрыі, на паўночным усходзе і ўсходзе ад возера Балатон, нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка і нанеслі яму вялікія страты. У баях за 11 сакавіка ў гэтым раёне агнём нашай артылерыі знішчана 54 нямецкія танкі і самаходныя гарматы і, апрача таго, падбіта і падарвалася на нашых мінных палях 27 танкаў і самаходных гармат праціўніка.

На другіх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 11 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 168 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 102 самалёты праціўніка.

**У адказ на загад правадыра**

## Новы вытворчы ўздым у працы

На загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна аб 27-ай гадавіне Чырвонай Арміі, калектыў працаўнікоў паравознага дэпо горада Ліды адказаў новым уздымам вытворчасці працы.

Выконваючы свае абавязацельствы слёсары-гарнітуршчыкі таварышы Паўляеў І. В. і Валеўша А. В. выконваюць вытварчую норму на 460%, токар тав. Міцкевіч на 291%, слёсар тав. Ляпін на 262%, слёсар-арматуршчык тав. Ракіцкі на 275%, слёсар-аўтаматчык тав. Далінскі на 375%, перавыконваюць свае вытворчыя нормы, і многія другія працаўнікі дэпо.

Машыністы-лунінцы таварыш Бахтэхчук і Герлюк дабіліся перавыканання тэхнічнай скорасці на 7-8 кіламетраў, яны працуюць на сваіх паравозах без адзінага заезда ў дэпо на рамонт сваіх паравозаў. Іх поспех абумоўлен тым, што яны па-лунінску ўтрымоўваюць свае паравозы ў культурным стане.

**Д. Чыркоў.**

**КОМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ**

## Пастанова XIII пленума ЦК ВЛКСМ у масы

9 сакавіка г.г. адбыўся сход комсамольскага актыва горада. На сходзе абмяркоўвалася пытанне, як праводзяцца ў жыццё пастановы XIII пленума ЦК ВЛКСМ — аб палепшанні палітычна-масавай работы сярод моладзі і аб палепшанні работы комсамольскіх арганізацый школ ФЗВ, чыгуначных і рамесленых вучылішч.

З дакладам—аб задачах комсамольскіх арганізацый горада, па правядзенню ў жыццё пастаноў XIII пленума ЦК ВЛКСМ,—выступіў сакратар гарадскога камітэту ЛКСМБ тав. Гуськоў. У спрэчках па дакладу тав. Гуськова выступіла 9 комсамольскіх актывістаў, якія ўскрылі недахопы ў рабоце комсамольскіх арганізацый горада і намецілі рад мерапрыемстваў па хутчэйшаму правядзенню ў жыццё пастаноў XIII пленума ЦК ВЛКСМ.

У рабоце схода комсамольскага актыва прымаў удзел сакратар гарадскога камітэта КП(б)Б тав. Ларычаў, які выступіў з прамовай—аб задачах комсамольскіх арганізацый горада ў ідэйна-палітычным выхаванні моладзі. На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі інтэлігенцыі горада.

Сход комсамольскага актыва прыняў разгорнутую пастанову.

